ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
12 ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 5(1526)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### Бюро парткома

на чарговым пасяджэнні абмеркавала дзейнасць партыйнай арганізацыі НДІ прыкладных фізічных праблем па развіццю крытыкі і самакрытыкі, работу з пісьмамі, скаргамі і прапановамі працоўных. Адзначана пэўная работа па развіццю дэмакратычных прынцыпаў кіравання калектывам. Разам з тым падкрэслена, што крытыка і самакрытыка ўсё яшчэ не сталі ў поўнай меры нормай дзейнасці партыйнай арганізацыі НДІ ПФП. У партыйным бюро адсутнічае сістэма работы з крытычнымі заўвагамі і прапановамі. Пастановы сходаў не заўсёды носяць канкрэтны характар, іх выкананне не кантралюецца. Камуністы не інфармуюцца аб рэалізацыі выказаных імі заўваг і прапаноў.

Бюро парткома строга ўказала сакратару партыйнага бюро А. У. Зінкевічу і намесніку сакратара Я. С. Варапаю на неабходнасць паляпшэння работы з крытычнымі заўвагамі і прапановамі камуністаў. Даручана выпрацаваць дакладную сістэму ў рабоце з прапановамі і заўвагамі працоўных.

Былі разгледжаны таксама іншыя пытанні арганізацыйна-партыйнай і ідэалагічнай работы.

У. САТОЛІН,
інструктар парткома.

### Прайшоў

арганізацыйны сход, прысвечаны выбарам савета ветэранаў вайны і працы. Перад прысутнымі выступілі: намеснік сакратара партыйнага камітэта А. М. Рухля, студэнтка В. Царашкова, старшыня савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны І. В. Марчанка, рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.

Сход аднадушна выбраў савет ветэранаў вайны і працы, у састаў якога ўвайшлі: Б. Д. Анціпін, У. С. Багданаў, С. М. Благапалучны, М. Я. Бондар, М. В. Гарлатаў, В. П. Давыдаў, В. С. Даўгарукаў, А. М. Дземяшкевіч, А. В. Яраксін, Д. П. Жмуроўскі, М. Я. Зайцаў, В. В. Казлова, С. М. Касячэнка, Д. С. Кляймёнычаў, П. Т. Коваль, П. А. Ларкін, Г. Р. Марозаў, І. В. Марчанка, Д. Б. Мельцар, В. С. Мяцеліца, А. І. Наркевіч, І. М. Палянскі, А. М. Рукшын, Г. А. Сяргунін, Я. М. Тагуноў, Л. Р. Цегін, А. С. Фядэнка, Н. М. Хаўратовіч, П. М. Хмялеўскі, А. М. Шырокаў, М. І. Юзафовіч, В. Ф. Якушка.

Выбраны таксама прэзідыум у саставе 15 чалавек: І. В. Марчанка — старшыня савета, Н. М. Хаўратовіч — намеснік старшыні савета, Б. Д. Анціпін — сакратар савета, А. В. Яраксін, М. Я. Зайцаў, В. В. Казлова, П. Т. Коваль, А. М. Дземяшкевіч, Д. Б. Мельцар, Д. П. Жмуроўскі, М. Я. Бондар, В. С. Мяцеліца, І. М. Палянскі, В. С. Даўгарукаў, Я. М. Тагуноў.

Ж. КРУГЛІКАВА.



*усё спачатку*

## Дзень добры, новы семестр!

*ЦЯГНІК апошні раз здрыгануўся і стаў. Праваднiца адчыніла дзверы вагона:*

*— Мінск!*

*Вадзіцель аб'ехаў чараду чырвоных аўтобусаў, праціснуўся паміж імі і тармазнуў:*

*— Мінск!*

*Колы самалёта на імгненне слізганулі па бетоннай паласе і імкліва зашамацелі па ёй. Пасажыры з палёгкай уздыхнулі і глянулі ў ілюмінатары: самалёт разварочваўся ля будынка мінскага аэрапорта.*

*Мінск, Мінск, Мінск!*

*Скончыліся канікулы. Дзень добры, новы семестр!*

НА ЗДЫМКУ: студэнтка трэцяга курса гістарычнага факультэта Ірына Дзялендзік. Вучыцца дзяўчына на «добра» і «выдатна». Ірына — інструктар камітэта камсамола універсітэта.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# Памяць — у нас саміх

*вёкапомнае*

ВЫСТУПЛЕННЕ ДЭЛЕГАТА УСЕСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ЖАНЧЫН СТУДЭНТКІ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА М. ЗУЁНАК

ГАВОРАЦЬ, што жаночае сэрца па самой сваёй прыродзе найбольш чула адклікаецца на радасці, клопаты і ласку. Але яно ж стала сімвалам велізарнай мужнасці і гераізму ў гадзіны найцяжэйшых выпрабаванняў, якія выпалі на долю савецкага народа. Кожны, хто жыве на беларускай зямлі, у краі блакітных азёр і векавых пушчаў, ведае аб гэтым не толькі з кніг і фільмаў. Цяжкія страты беларускага народа. Загінуў кожны чацвёрты. Якая вялікая цана заплачана за тое шчасце, якое называецца жыццём!

Усіх, хто ўпершыню прыязджае ў Беларусь, да глыбіні душы ўзрушваюць тысячы абеліскаў у гарадах і вёсках. Праўда, адна заходняя журналістка, пабываўшы на Кургане Славы, узведзеным у гонар савецкіх воінаў на дваццатым кіламетры аўтамагістралі Мінск — Масква, і на плошчы Перамогі ў сталіцы Беларусі, умудрылася напісаць, што Мінск — мілітарызаваны горад, маўляў, навокал ваенныя помнікі. Не! Гэта было б абсурдам, калі б людзі ставілі помнікі вайне. У маі 1945 года медсястра з Беларусі распісалася на рэйхстагу: «Я — Соф'я Кунцэвіч — прыйшла ў Берлін, каб забіць вайну». Пад гэтымі словамі кволай дзяўчыны, якая вынесла з-пад агню 147 раненых і ўдастоена пазней медаля імя Флорэнс Найтынгейл, маглі паставіць подпісы мільёны савецкіх людзей. І мы, маладыя, сёння добра разумеем, што памяць не ў помніку, а ў нас саміх. Не ў якойсьці акцыі або кампаніі, а ў стане розуму і сэрца чалавечага. Але якая будзе цана нашай памяці, калі зарасце сцежка хоць да аднаго абеліска, калі не будуць кожны дзень адчыняцца дзверы ў дом салдацкай удавы?

Пра нас, маладых, часам з дакорам гавораць: «Дзе вам зразумець, што было?»

Я хачу расказаць аб выпускніцы нашага універсітэта Святлане Алексіевіч. Маладая журналістка па выхадных днях на працягу пяці гадоў ездзіла ў розныя канцы краіны, каб запісаць успаміны пяцісот з тых васьмісот тысяч жанчын, якія ў Вялікую Айчынную асвоілі ўсе прафесіі вайны. Ад імя свайго пакалення Святлана, на мой погляд, здзейсніла грамадзянскі подзвіг. На свет паявілася дакументальная кніга «У вайны не жаночы твар», якую сёння ведаюць ужо ў многіх краінах свету. Жанчыне-нявесце, жанчыне-маці, захавальніцы ачага і міру па сваёй сутнасці ненатуральныя разбурэнні і смерць. Але калі пагроза навісла над нашай Радзімай, над самім жыццём народа, жанчыны сталі на вогненны рубеж барацьбы з фашызмам. Маці, мабілізаваўшы ўсю сваю мужнасць, благаслаўлялі сваіх сыноў на ратны подзвіг за Айчыну. Ідуць і ідуць людзі да помніка маці, які ўзведзен у горадзе беларускіх аўтазаводцаў Жодзіна. Простая беларуская сялянка Настасся Фамінічна Купрыянава праводзіць сваіх пяцярых сыноў абараняць Радзіму, наближаць Дзень Перамогі, да якога ніхто з пяцярых не дажыве, а малодшы — Пётр Купрыянаў — будзе ўдастоен звання Героя Савецкага Саюза...

Беларускія жанчыны не толькі праводзілі на фронт мужоў і сыноў, але і самі адважна змагаліся ў партызанскіх атрадах, падполлі, на франтах Вялікай Айчыннай. Мы ганарымся імёнамі Герояў Савецкага Саюза Марыі Осіпавай, Алены Мазанік, Ефрасінні Зяньковай, Зінаіды Партновай, імёнамі многіх іншых выдатных жанчын краіны. Мы ганарымся іх вялікай мужнасцю, несакрушальнай воляй, цвёрдай перакананасцю, мы ганарымся сваёй Радзімай, якая выхавала гэтых мужных і цудоўных дачок.

У Мінску на Цэнтральнай плошчы ёсць музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Адна з залаў гэтага музея аддадзена пад цыкл карцін народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага. Ва ўсе стагоддзі і часы паэты і мастакі адлюстроўвалі мадонну з дзіцем як сімвал жыцця, дабра і святла. На адной з карцін гэтага мастака мадонна з дзіцем паказана на фоне злавеснай трубы крэматорыя. Хачу прывесці толькі адзін запіс у кнізе водгукаў: «Калі б гэту карціну ўбачылі ўсе людзі зямлі, вайны ніколі б не было».

Нас, савецкіх людзей, іншы раз папракаюць: як страсна змагаецеся за мір, а ўвесь час гаворыце аб вайне. Але ў старажытнасці нездарма гаварылі — калі вайну забываюць, пачынаецца новая. Памяць становіцца нашай магутнай і дзейснай зброяй у барацьбе з тымі, хто раздувае на зямлі пажары новых войнаў. Я гавару ад імя юнакоў і дзяўчат Савецкай Беларусі. Усім сэрцам мы адабраем і падтрымліваем унутраную і знешнюю палітыку нашай партыі. І ўсе свае сілы, маладую энергію аддадзім увасабленню іх у жыццё.

Студэнты Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя Уладзіміра Ільіча Леніна ўносяць і будуць уносіць свой уклад у справу барацьбы за ідэалы нашага грамадства, за мір на зямлі. Мы шэфствуем над помнікамі, брацкімі магіламі, сем'ямі загінуўшых, арганізуем сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Героі вайны і працы ўключаюцца ў спісы ганаровых байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Грошы, пералічаныя ў фонд ганаровага байца, ідуць на будаўніцтва помнікаў героям.

Дарагія жанчыны, дазвольце запэўніць вас, што мы і надалей будзем памнажаць свой уклад у справу ўмацавання магутнасці і працвітання нашай Радзімы, у справу барацьбы за мір на зямлі. Сваё выступленне я хачу закончыць словамі паэта Андрэя Дзяменцьева:

Как мало еще нам исполнилось лет.
И вечная молодость. Старости нет.
И жизнь наша с вами — еще целина.
Добра и надежды взошли семена.
И прожитый день — это верность отцам.
И память с мечтою у нас пополам.

*на тэмы маралі*

# МОМАНТ ІСЦІНЫ

**У ВЫДУМАНЫХ ГЕНАДЗЕМ Л. ФАКТАХ УЛАСНАЙ БІЯГРАФІІ ХЛУСНЯ ВЫСТУПАЛА ЎЖО ЯК СІНОНІМ ЗДРАДНІЦТВА.**

Сустрэчы з Генадзем Л. (будзем называць нашага героя так) не хапала, як апошняй цаглінкі, што надае збудаванню канчатковую выразнасць. Без шчырай размовы нельга было да канца зразумець гісторыю, што здарылася на юрыдычным факультэце Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Ён — прыйшоў. Суботнім ранкам (астатнія дні, паводле яго слоў, цяпер прападае на рабоце) сядзелі мы ва ўтульным скверыку. Мой субяседнік быў на дзіва спакойны. Цвыркалі, пераскокваючы з галінкі на галінку, непаседы-вераб'і. У паветры насіліся тапаліныя насмешніцы-пушынкі. «Чалавек-усмешка» — успомнілася раптам факультэцкая мянушка, якая замацавалася за ім з яго ж лёгкай рукі.

Каб у нялёгкім расказе не было і намёку на дэтэктыў, адразу прывяду прысуд, які цяпер ніхто не аспрэчвае. Яго вынесла жыццё і запратакаліравала бюро Маскоўскага райкома камсамола г. Мінска. «Разгледзеўшы апеляцыю выключанага з радоў ВЛКСМ таварыша Л., лічыць рашэнне бюро камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна правільным». І фармуліроўка: «за няшчырасць перад ВЛКСМ, што праяўлялася ў спекуляцыі на свяшчэнным пачуцці патрыятызму і падман даверу таварышаў». Загадам рэктара студэнт юрфака Л. выключаны з універсітэта па асабістай просьбе...

З размовы з Генадзем Л.

— Які самы светлы ўспамін дзяцінства?

— ...

— А наогул — у жыцці?

— Вучоба ва універсітэце. Смешна?

— Хутчэй незразумела...

— Сакурснікі мне дапамаглі «вузел» рассекчы. Мабыць, хтосьці зараз пры сустрэчы і рукі не працягне, усё роўна скажу «дзякуй». Камень з душы споўз — хлусіць не трэба! Былое ўспомню — скалануся...

Так гаворыць ён сёння. Але каб да канца асэнсаваць тое, што здарылася, неабходна выслухаць і іншых удзельнікаў падзей.

Вячаслаў **КАРАТКЕВІЧ**, студэнт юрфака:

— На першай «бульбе» нехта жартам яго акуляры «прымераў». А ён: «Страціў зрок у Афганістане». Чамусьці ўвесь час лічыў, што над ім спрабуюць пацяшацца... Казаў, быццам узнагароджаны ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга, а таксама вышэйшай афганскай узнагародай — ордэнам Сонца Свабоды. А яшчэ, што з'яўляўся ганаровым грамадзянінам горада Герата ці... Кабула. Калі запыталі, чаму ніколі яго не відаць з узнагародамі, пачулі «сціплы» адказ: «Пераслаў іх у музей». Пазней даведаліся, што гэта была хлусня.

Уладзімір **БРУСНІКАЎ**, студэнт:

— Яго манеры вабілі. Напачатку ўсе паводзілі сябе крыху насцярожана. А Генадзь быў сама «ўсмешка» — душа нараспрыст. Вечарам, пад гітарныя пераборы, пачыналіся ўспаміны «бывалага воіна». Гэта было падобна на тэатр. Але верылі: чалавек пабываў там... У групе ён быў адзіны, хто, лічылася, адслужыў у ДРА.

Мізам **МУРАТАЎ**, студэнт юрфака:

— Там жа, на «бульбе», падышоў паслухаць чацвёртакурснік Аляксей Стаўроўскі, што служыў у Афганістане. Дык і той згадзіўся: «Хлопец, што трэба — герой! Я да сябе дамоў запрашаў. Калі Л. расказваў свае жорсткія «легенды» — жонка плакала...».

Аляксандр **ДЗЕМЯШКЕВІЧ**, студэнт юрфака, кавалер ордэна Чырвонай Зоркі:

— Людзі да нас горнуцца з адкрытай душой. Мяне пазнаёмілі з ім у час перапынку. Пытаюся: дзе служыў? У маім палку! А дзе стаялі? Чую назву — няма там такога кішлака! Раптам званок на лекцыю: нічога, вырашыў, дагаворым...

Сяргей **БАЛАШЭНКА**, студэнт юрфака:

— Чаму толькі праз паўтара года ўсё адкрылася? Тэма хлусні была — святая...

Святая! І хіба ж магчыма святасці гэтай не разумець?

Жудасны факт: неяк пайшла гуляць па курсе легенда аб тым, як падарваўся Генадзь Л. на душманскай міне і цэлы ўзвод (уявіце) прапанаваў яму скуру для перасадкі. Як... Прабачце, іншыя падрабязнасці проста не ўмяшчаюцца ў чалавечым уяўленні...

З размовы з Генадзем Л.

— Клянуся: карыслівых інтарэсаў не «праследаваў». Арэол, што склаўся, і быў «карыслівай мэтай». У групе ніякіх прывілей не прасіў, выкладчыкам у «вушы» нічога не ўкладваў...

Усё ж наш нелірычны «герой» у апошніх словах яўна какетнічаў. Так, ён не меў асаблівай цягі да вучобы, але спраўна наведваў заняткі.

— Ён быў «шэрым конікам» у жыцці, але любіў, каб яго «шкадавалі»,— скажа мне камсорг Ала Стрыга.

...Неяк ашаломленыя аднакурснікі пачулі расказы «чалавека-ўсмешкі» пра гібель семнаццацігадовага брата. І пра яго ўласную клінічную смерць — маўляў, далі аб сабе знаць раненні. Парторг курса Сяргей Балашэнка, уражаны пачутым, «выбіў» у дэканаце не прызначаную Генадзю Л. стыпендыю. Той не адмовіўся — успрыняў як належнае! Ярусся сцвярджаць: здавацца, а не быць «чалавек-усмешка» імкнуўся ўсюды. Урэшце, не на юрыдычным жа факультэце Белдзяржуніверсітэта даведалася Генадзева суседка Тэся Антонаўна Лятун пра новаспечанага героя — воіна-інтэрнацыяналіста?! Ды і Веры Дзмітрыеўне Бурай, яго былой школьнай настаўніцы, упэўненасці ў беспамылковасці ўласных вывадаў было не займаць. Яшчэ па тэлефоне папярэдзіла... «Л.? Быў як усе і нават лепшы...»

У пошуках вытокаў надзвычайнага здарэння я сустрэўся з жанчынамі. Мае субяседніцы загаварылі горача:

— Узрост такі, што кожнаму хочацца ўявіць сябе героем!

— Гена заўсёды вызначаўся выхаванасцю, стрыманасцю, працавітасцю. На канікулах практыку ў калгасе адпрацоўваў — дакумент прынёс. Ён добры. Настаўнікам благога слова не сказаў. І сям'я такая...

Логіка жанчын нагадала ўстаноўку: гэтага не можа быць, таму што гэтага не можа быць ніколі.

З размовы з Генадзем Л.

— Ці задумваўся, чым усё скончыцца?

— У «глыбіню» не зазіраў...

Іншы раз чамусьці лічаць, што вышэйшая адукацыя далучае да вышэйшых праяў чалавечага духу. Наш герой здолеў бы на памяць прачытаць любімыя ім радкі Ясеніна аб «неисчерпаемой печали полей и белом перезвоне берёз». А ці ўсвядоміў выпакутаваны ўсім існаваннем радок паэта: «Не хочу я небес без лестницы...».

Усё ж ці прымяняльныя для азначэння таго, што здарылася, такія паняцці, як бесхарактарнасць, інфантылізм?!

І зноў — слова былым сакурснікам «чалавека-ўсмешкі», на чыіх вачах штодня адбывалася яго маральнае падзенне.

Сяргей **БАЛАШЭНКА**:

— Хто толькі не адказвае за выхаванне асобы: сям'я, школа, універсітэт, камсамол. Але паколькі ніхто да апошняга часу не разглядзеў за маскай сапраўдны твар Генадзя, значыць, ніхто сур'ёзна выхаваннем не займаўся! Мы не «спісваем» уласнай віны: абавязаны былі «разглядзець» чалавека...

Аляксандр **ДЗЕМЯШКЕВІЧ**:

— Гэты... дзеля свайго «маленькага» гатовы ахвяраваць усім.

Вячаслаў **КАРАТКЕВІЧ**:

— Аднойчы сядзелі разам на семінары па крымінальнаму праву. Узнік дыспут аб ступені гуманізму ў адносінах да злачынцы. Гена сціснуў кулакі: «усіх трэба караць...». Я не хацеў бы звярнуцца да такога следчага!

З размовы з Генадзем Л.

— Для мяне, калі застаўся б ва універсітэце, у пяць разоў цяжэй было б глядзець усім у вочы.

— А змог бы ўсім — у вочы?!

Выпадак на юрфаку БДУ імя У. І. Леніна нагадвае аб ісцінах вечных. Аб тым, што самае важнае ў жыцці — не страціць ідэалаў, бо інакш губляецца асоба. Аб тым, што годнасць наша вызначаецца дарогай, якой ідзём да мэты, а не толькі тым, ці дасягнем яе. Нішто не замяніць Праўду.

Час непазбежна ставіць усё на месцы. Сёння меркай годнасці становіцца сумленнасць, а не запэўніванне ў ёй, калі немагчыма за гучнай фразай хаваць нядобрыя ўчынкі.

Больш за гадзіну гаворым з Генадзем. Упарта спрабую прабіцца да нечага, быццам яшчэ схаванага ў яго карых вачах. Хачу пачуць голас сумлення — пакутлівага, але абуджанага. Размова, адчуваю, балючая. Я разумею субяседніка. Нялёгка ў 22 гады апынуцца, як кажуць, «на краі» — і адначасова на пачатку жыцця. Калі б можна было намаляваць партрэт душы, мы, напэўна, убачылі б састарэлы твар... дзіцяці. Не збыліся радасныя надзеі, планы, а па-сапраўднаму зразумелага так няшмат... Зусім не да смеху «чалавеку-ўсмешцы»...

З размовы з Генадзем Л.

— Як думаеш жыць далей?

— Працаваць, сумленна працаваць...

— Што значыць, па-твойму, жыць «па праўдзе»?

— Проста не лгаць... Ці выгадна жыць непраўдзіва? Не... І яшчэ раз не! З віду будзе падавацца, што ты шчаслівы, а ў душы, які б ні быў, кошкі скрабуць. Аб мінулым успамінаю, як аб дурным сне. Пасля ўсяго хацелася ўчапіцца за «саломінку», апеляцыю ў райком падаў. Зараз толькі зразумеў — дарэмна. А ў мяне ж была свая служба — у Маскве. Выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі дадому вярнуўся, граматы прывёз... І я зразумеў: мяне могуць паважаць такога, які ёсць: з недахопамі — у акулярах — могуць!

Асабіста для мяне гэта і быў, магчыма, доўгачаканы момант ісціны. Калі сказана Праўда, якая прадугледжвае дзеянне. Таму не называю поўнага прозвішча свайго героя. Не хачу, каб у сумленнае жыццё ўваходзіў ён пад цяжарам «маскі»... А яшчэ... Праз некалькі гадоў хацеў бы расказаць пра сапраўднае вяртанне «чалавека-ўсмешкі». Чуеш, Генадзь?!

В. СЯМАШКА.

*газета выступіла. Што зроблена?*

## Кафэ расчыняе дзверы

6 ЛІСТАПАДА 1986 г. у № 28 «Беларускага універсігэта» была змешчана публікацыя У. Мотузава «Гаўдэамус», дзе ўказвалася на недахопы ў арганізацыі работы студэнцкага кафэ універсітэта. Абмеркаванне публікацыі адбылося на нарадзе апарату камітэта камсамола. Нам адказвае сакратар камітэта камсамола А. Жук:

«У перыяд падрыхтоўкі да XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве на базе кафэ працаваў гарадскі фестывальны клуб, праводзілася вялікая колькасць мерапрыемстваў, што нярэдка стварала арганізацыйныя цяжкасці ў працы. Пасля гэтага кафэ больш года знаходзілася на рамонце. З 13 снежня кафэ ўзнавіла сваю работу. Пры садзейнічанні камітэта камсамола была набыта музычная апаратура. Камандзіру АКАД універсітэта Ю. Бацяну ўказана на неабходнасць зладжанай арганізацыі дзяжурства дружыннікаў».

*вырашаецца праблема*

## Дыягназ анежскаму цуду

**Вонкавы выгляд Прэабражэнскай царквы ў Кіжах аказаўся падманлівым — пабудова захавалася значна лепш, чым лічылася да гэтага часу. Такі вывад зрабілі беларускія і ленінградскія спецыялісты ў выніку вывучэння гэтага помніка драўлянай архітэктуры. Інструментам для даследаванняў паслужыў прыбор, створаны калектывам кафедры ядзернай фізікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.**

ПРЫБОР гэты, названы радыёізатопным шчыльнамерам, павінен дапамагчы ў вырашэнні шматгадовай спрэчкі аб лёсе анежскай жамчужыны. А колькі ж коп'яў было зламана ў палеміцы, колькі розных прапаноў падалі рэстаўратары — аж да таго, каб побач з царквой пабудаваць «дублікат», а арыгінал разабраць на часткі і выставіць для агляду!

Аднак дадзім слова тым, хто стаў першым гаспадаром неаспрэчных і каштоўных для спецыялістаў фактаў.

Усё пачалося з таго, што вучоным Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі спатрэбіўся дакладны і хуткі метад вызначэння шчыльнасці драўніны, вільготнасці і масы тэхналагічнай дранкі,— гаворыць дацэнт БДУ, кандыдат тэхнічных навук В. А. Чудакоў.— Распрацаваны ў нас лічбавы шчыльнамер аказаўся для гэтых мэт вельмі дарэчы.

З дапамогай прыбора можна вызначаць плывучасць драўніны, прагназіраваць яе якасць, аўтаматычна сартаваць піламатэрыялы... І нават ацаніць ступень пагрозы для акружаючых старога дрэва ў парку.

Калі нарадзілася ідэя праверыць стан бярвенняў у сценах Прэабражэнкі, у Кіжы выязджаў малодшы навуковы супрацоўнік кафедры В. І. Гурыновіч. Кіраваў даследаваннямі старшы навуковы супрацоўнік акадэміі, кандыдат тэхнічных навук В. Н. Крылоў.

— Наша група, у якую ўваходзілі студэнты-дыпломнікі, працавала на добраахвотных асновах па просьбе дырэкцыі музея-запаведніка і зрабіла дзесяткі тысяч замераў.— гаворыць вучоны.— Гама-праменнямі прашчупвалі кожны метр бярвенняў. Хоць даныя яшчэ апрацоўваюцца на ЭВМ, ужо ясна, што ў 37-метровым драўляным храме трэба толькі закансерваваць або замяніць менш дзесяці працэнтаў бярвенняў. А раней думалі, што драўніна разбурана на 70 працэнтаў...

На думку фізікаў, неабходна выслабаніць царкву і ад некалі пабудаванага недарэчнага металічнага каркаса, вярнуць ёй першапачатковае ўнутранае ўбранне.

К. СТАЛЯРЧУК.

*вакно ў прыроду*



БАДАЙ, няма ніводнага чалавека, які б не бываў у сасновым бары, не ведаў, што вырабляецца з жывіцы, хвоі, сасны. А вось сасну варатнічковую, напэўна, мала хто бачыў. Адно з такіх рэдкіх дрэў расце ў Негарэльскім вучэбна-вопытным лясгасе на Дзяржыншчыне.

НА ЗДЫМКУ: сасна варатнічковая.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# У калектыве універсітэта з 1 студзеня па 1 красавіка праводзіцца абмен прафсаюзных дакументаў

## Абмен прафсаюзных дакументаў

*Пастанова Прэзідыума ВЦСПС ад 23 жніўня 1983 года*

*У адпаведнасці з рашэннем XVII з'езда прафесіянальных саюзаў СССР аб правядзенні абмену прафсаюзных білетаў Прэзідыум ВЦСПС ПАСТАНАЎЛЯЕ:*

*1. Прыступіць да абмену прафсаюзных білетаў і ўліковых картачак членаў прафсаюзаў з 1 кастрычніка 1983 года і закончыць гэтую работу ў 1987 годзе.*

*Выкарыстоўваць гэтую важную кампанію для далейшага ўзмацнення ролі прафсаюзаў у рэалізацыі задач, пастаўленых XXVI з'ездам партыі, лістападаўскім (1982 г.) і чэрвеньскім (1983 г.) Пленумамі ЦК КПСС, пастановай ЦК КПСС «Аб рабоце ЦК прафсаюза рабочых цяжкага машынабудавання» і XVII з'ездам прафсаюзаў СССР, для паляпшэння работы прафсаюзных арганізацый, павышэння працоўнай і грамадскай актыўнасці членаў прафсаюзаў, іх адказнасці за выкананне статутных патрабаванняў.*

*2. Абавязаць саветы і камітэты прафсаюзаў:*

*распрацаваць і ажыццявіць мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню абмену прафсаюзных дакументаў;*

*арганізаваць інструктаж і навучанне прафсаюзных кадраў і актыву па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення абмену прафсаюзных дакументаў;*

*устанавіць пастанны кантроль за ходам падрыхтоўкі і абмену прафсаюзных дакументаў у пярвічных прафсаюзных арганізацыях, аказваць ім усебаковую практычную дапамогу ў своечасовым і якасным ажыццяўленні гэтай работы.*

*3. Накіраваць цэнтральным камітэтам, рэспубліканскім, краявым, абласным саветам і камітэтам прафсаюзаў інструктыўна-метадычнае пісьмо аб парадку правядзення абмену прафсаюзных дакументаў (прыкладаецца).*

*4. Даручыць рэдакцыям прафсаюзных газет і часопісаў усебакова асвятляць падрыхтоўку і ход правядзення абмену прафсаюзных дакументаў.*

## Парадак абмену прафсаюзных білетаў

Прафсаюзныя білеты ўручаюцца членам прафсаюза ва ўрачыстай абстаноўцы старшынёй, намеснікам старшыні прафкома (цэхкома), а ў невялікіх пярвічных прафарганізацыях упаўнаважаным вышэйстаячага прафсаюзнага органа. Выдача прафсаюзнага білета рэгіструецца ў кнізе ўліку атрыманых і выдадзеных прафсаюзных білетаў.

Стары білет застаецца ў члена прафсаюза, бо прафсаюзны білет можа служыць пацверджаннем стажу работы пры адсутнасці іншых дакументаў (Палажэнне аб парадку прызначэння і выплаты дзяржаўных пенсій. Зацверджана пастановай Савета Міністраў СССР ад 3 жніўня 1972 года № 590—СП СССР 1972 г., № 17, арт. 86). На ўсіх старонках старога прафсаюзнага білета робіцца надпіс «Абменены». Старыя ўліковыя картачкі членаў прафсаюзаў знішчаюцца ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб уліку членаў прафсаюза.

Пры выдачы прафсаюзнага білета з члена прафсаюза ўзымаецца 10 капеек.

Абмен прафсаюзных білетаў і ўліковых картачак членамі прафсаюза, якія своечасова не атрымалі новыя прафсаюзныя білеты з прычыны камандзіроўкі, хваробы, чарговага адпачынку ці іншых уважлівых прычын, праводзіцца пасля іх вяртання ў двухтыднёвы тэрмін.

Рэштку бланкаў прафсаюзных білетаў і ўліковых картачак старога ўзору прафком перадае вышэйстаячаму прафсаюзнаму органу. Яны выкарыстоўваюцца ў тых прафсаюзных арганізацыях, абмен у якіх будзе праходзіць у больш позні тэрміны. Пасля завяршэння абмену у цэлым па вобласці, краі, рэспубліцы нявыкарыстаныя бланкі прафбілетаў і ўліковыя картачкі старога ўзору знішчаюцца па акту.

## Запаўненне бланка прафсаюзнага білета

Усе радкі першай старонкі новага прафсаюзнага білета запаўняюцца чорнай тушшу ў поўнай адпаведнасці з данымі новай уліковай картачкі члена прафсаюза. У прафсаюзных білетах саюзных рэспублік (акрамя РСФСР) адзін тытульны ліст бланка прафсаюзнага білета запаўняецца на рускай мове, а другі — на нацыянальнай мове рэспублікі. Памаркі і папраўкі ў прафсаюзным білеце не дапускаюцца. Нумар новага прафсаюзнага білета прастаўляецца ва ўліковай картачцы.

У раздзеле «Штогадовая адзнака аб уплаце членскіх прафсаюзных узносаў» адзнака аб уплаце членскіх прафсаюзных узносаў праводзіцца штогадова ў канцы каляндарнага года, а таксама пры зняцці з уліку члена прафсаюза. Гэты запіс падпісваецца старшынёй прафсаюзнага камітэта (прафарганізатарам) ці старшынёй цэхкома (прафбюро) і завяраецца пячаткаю.

У новы прафсаюзны білет пераносіцца са старога прафсаюзнага білета дата прыняцця на ўлік у даную прафсаюзную арганізацыю і завяраецца подпісам старшыні прафкома і пячаткаю прафсаюзнага камітэта.

На прафсаюзным білеце і ва ўліковай картачцы члена прафсаюза наклейваецца фотакартка ўладальніка прафсаюзных дакументаў і ставіцца чорнай мастыкай пячатка прафсаюзнай арганізацыі, тэкст адбітка пячаткі павінен добра чытацца і захопліваць частку фотакарткі, а таксама подпіс члена прафсаюза і старшыні прафкома.

У раздзеле «Адзнакі» на аснове прадстаўленых дакументаў праводзіцца запіс аб узнагародах члена прафсаюза за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці (Ганаровай граматай прафсаюзаў, нагруднымі знакамі ВЦСПС).

## Парадак афармлення

Запаўненне прафсаюзных дакументаў пачынаецца з уліковых картачак. Усе ўліковыя картачкі членаў прафсаюзаў запаўняюцца на рускай мове фіялетавым чарнілам ці чорнай тушшу, чоткім і разборлівым почыркам. Выпраўленні і памаркі ў дакументах не дапускаюцца.

Асноўная прафесія члена прафсаюза запісваецца да моманту запаўнення ўліковай картачкі: для рабочых — гарнавы доменнай печы, токар, апаратар аўтаматычных ліній, машыніст экскаватара і г. д.; для служачых — спецыяльнасць па адукацыі, а пры адсутнасці дакументаў аб адукацыі — практычная работа (інжынер, тэхнік, аграном, эканаміст, урач і г. д.).

У радку «Адукацыя» адпаведна запісваецца пачатковая, няпоўная сярэдняя, сярэдняя, незакончаная вышэйшая, вышэйшая. Няпоўная сярэдняя адукацыя ўказваецца ў тым выпадку, калі член прафсаюза закончыў восем класаў (сем класаў да 1962 года), вучыцца ў 9—10 класе вячэрняй школы, у тэхнікуме, у сярэднім прафесійна-тэхнічным вучылішчы.

Незакончаная вышэйшая адукацыя запісваецца, калі член прафсаюза правучыўся ў вышэйшай навучальнай установе палову ці больш паловы тэрміну ўсяго навучання.

У новай уліковай картачцы члена прафсаюза месяц і год уступлення ў прафсаюз павінны адпавядаць запісам ва ўліковай картачцы і прафсаюзным білеце ўзору 1959 года з неабходным удакладненнем. Назва месяца пішацца поўнасцю, напрыклад, «верасень 1962 года».

У радку «Назва прафсаюза і арганізацыі, якая выдала білет» указваецца, напрыклад, «прафсаюз рабочых тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці, прафком Фрунзенскай баваўнянапрадзільнай фабрыкі імя 50-годдзя СССР».

У раздзеле «Месца працы і пасада пры запаўненні картачкі і наступныя змены» указваецца займаемая пасада члена прафсаюза на момант запаўнення новай уліковай картачкі, напрыклад, «з 1972 года інжынер-тэхнолаг Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі».

У раздзел «Адзнака аб прыёме на ўлік, зняцці з уліку і ўплаце членскіх узносаў» пераносіцца са старой уліковай картачкі дата прыняцця на ўлік у даную прафсаюзную арганізацыю, а ў графе аб уплаце членскіх узносаў прастаўляецца месяц і год, з якога член прафсаюза плоціць членскія ўзносы ў гэтай арганізацыі. Напрыклад, інжынер-тэхнолаг Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі прыняты на ўлік у прафсаюзную арганізацыю ўказанага завода «6 мая 1972 года», у графе аб уплаце членскіх узносаў прастаўляецца «з мая 1972 года».

*газета выступіла. Што зроблена?*

## «Лёгкай працы не шукаем!»

*— так называўся матэрыял студэнта біяфака С. Сакалоўскага, змешчаны ў № 31 ад 27 лістапада 1986 года. Шмат пытанняў закрануў аўтар. За каментарыем мы звярнуліся да прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы У. І. Тарасевіча:*

*«Будаўніцтва біялагічнай базы пачата ў 1976 годзе. Яно ажыццяўляецца Вілейскім МПМК-84. Тэрмін заканчэння будаўніча-мантажных работ меркаваўся на IV квартал 1986 года.*

*Адставанне ў будаўніцтве Вілейскай біябазы выклікае заклапочанасць у кіраўніцтва універсітэта, прымаюцца меры па паскарэнню яе ўводу ў дзеянне».*

*толькі факт*

## Поспех кнігі

КНІГА «Шматграннікі, графы, аптымізацыя» загадчыка кафедры матэматычнага забеспячэння АСК дацэнта М. М. Кавалёва, прафесара В. А. Ямелічава (БПІ), старшага навуковага супрацоўніка М. К. Краўцова (НДІ пры Дзяржплане БССР), якая выйшла ў 1981 годзе ў выдавецтве «Наука» (Масква), перавেдзена на англійскую мову ў Англіі у выдавецтве Кембрыджскага універсітэта і на нямецкую мову ў ГДР у выдавецтве «Наука» (Берлін).

З'явілася ўжо некалькі рэцэнзій на гэтую кнігу як у нашай краіне, так і за мяжой. Вось некаторыя ацэнкі:

«Манаграфія ахоплівае вялікі матэрыял па вывучэнню мностваў дапушчальных рашэнняў разнастайных задач аптымізацыі, дае добрае ўяўленне аб сучасным стане і перспектывах развіцця камбінаторнай тэорыі шматграннікаў і з'яўляецца унікальнай». (В. Л. Ваўковіч, часопіс «Кібернетыка». Кіеў, № 1, 1984 г.).

«Гэтая энцыклапедычная праца, прысвечаная камбінаторнай тэорыі шматграннікаў, даследуе алгебраічныя якасці шматграннікаў, цесна звязаныя з праблемамі аптымізацыі». (К. В. Л. Гарнер. часопіс Міжнароднага статыстычнага інстытута, Каралеўскі каледж, Лондан).

«Гэта першая манаграфія, прысвечаная камбінаторнай тэорыі шматграннікаў... Кніга з'яўляецца добрым памочнікам для ўсіх тых, хто працуе ў галіне камбінаторыкі, даследавання аперацый і вылічальнай тэхнікі з інтарэсамі ў аптымізацыі і лінейным праграміраванні». (З анатацыі да англійскага выдання кнігі).

«Багацце новых звестак у кнізе прывяло мяне ў захапленне... Я магу яе смела рэкамендаваць любому, хто цікавіцца праблемамі аптымізацыі, якія стаяць па значнасці ў першым радзе практычных, а таксама чыста матэматычных праблем, якія ў гэтай кнізе выкладаюцца з такой шырынёй і глыбінёй». (П. Макмюлен, Бюлетэнь Лонданскага матэматычнага таварыства. Т. 17, 1985).

Есць таксама станоўчыя рэцэнзіі на кнігу ў часопісах ГДР, Заходняга Берліна, Канады і г. д.

А. ШАРАПА,
прарэктар па міжнародных сувязях.

*наш фотаконкурс*



*Фотаэцюд В. КАРАЛЯ.*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

12 лютага 1987 года.

АТ 06172. Зак. 250.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.